Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 10 Вільня, Нядзеля 6 Сакавіка 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА" каштуе на год—4 зл. на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл. Заграніцу ўдвая даражэй.
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Палескі клін ужо заганяюць.

Год з лішнім таму назад (7.II.31 г.) мы пісалі на гэтым мейсцы, што Польшча ўжо ад самога пачатку свайго існаваньня рахавалася з магчымасьцю паўставьня незалежных Беларусі і Украіны, якія маглі-б быць перашкодай для гандлёвых зносін польскага цяжкога промыслу з вялікім расейскім рынкам збыту.

Дзеля гэтага польская палітыка ўсялякай масьці старалася і стараецца знайсьці трывалкі мост, які лучыў-бы Польшчу з Расеяй беспасярэдна. Мейсцам для будовы гэткага маста было выбрана Палесьсе, з тым, што найбольшыя хоць-бы кошты, пакладзеныя на яговую ў гэтым мейсцы будову, ніколі ня былі-б за вялікія і заўсёды аплаціліся-б найменш трэйчы. Гэткі мост: 1. пазволіў-бы мець беспасярэдныя зносіны Польшчы з Расеяй, 2. дзяліў-бы клінам натуральных саюзьнікаў — Беларусь і Украіну і 3. быў-бы мейсцам для адплыву вадбытку насельніцтва з пералюдненых краін этнографічнай Польшчы.

Пералічаныя тры пункты гэта канва, па каторай увесь час шыецца ўся польская палітыка на Палесьсі. З гэтых пунктаў выходзячы можна і трэба разумець, чаму польская ўстава аб Зямельнай Рэформе з дня 28.XII.25 г. пакідае абшарнікам на Палесьсі — як і на рэшце зямель этнографічна няпольскіх — 300 гэктараў зямлі, тады як у этнографічнай Польшчы гэта норма зьніжана да 180 га; з гэтых пунктаў выходзячы можна і трэба разумець, чаму Польшча садзіла і садзіць сапраўды паказныя сумы грошай на асушку Палесься; згэтуль урэшце выходзячы трэба разумець і толькі што прыняты польскім Соймам новы закон аб асадніцтве,*) за каторы дружна галасавалі пасолы з Б.Б. і Н.Д. (эндэцы) — на гэта дык яны дружныя! — і каторы папхне новую хвалю польскага асадніцтва ў першую хіба калею на наша-ж Палесьсе.

Гэткае настаўленьне польскай палітыкі на Палесьсе ня ёсьць выпадковым; яно ёсьць вынікам да падробнасьці прадуманай, абрахаванай і ў жыцьцё ўжо праводжанай акцыі польскага грамадзянства, як гэта пацьвердзіў дырэктар сярэдняй земляробскай школы ў Сьродзе (Пазнаншчына) інж. С. Половіч у сваей брашуры „Wielkopolanie, na front poleski!" 1931 г. Зьмест гэтае брашуры мусіў-бы быць цікавай тэмай для асобнага ў гэтай справе рэфэрату. Тут-жа з канешнасьці трэба агранічыцца да некалькіх толькі пунктаў.

С. Половіч сьцьвярджае насамперш, што дагэтуляшняя польская колёнізацыя на Усходзе не ўдалася і прычыну гэтага аўтор бачыць у тым, што польскія колёністы асядалі ў нас не самкнутай масай, а паасобку. Лёгічны аўторскі вьснавак з гэтага ёсьць, каб на будучыню польская колёнізацыя адбывалася цэлымі грамадамі.

Гэта думка, аказуецца, не „пакутуе" толькі на паперы: Пазнанскія палякі ўжо праводзяць яе ў жыцьцё. Паветавы Соймік у Сьродзе быў першым з тых, што кожны год ужо высылае на Палесьсе па 20—22 сямейных польскіх калёністых, даючы кожнаму з іх у разсрочку гатовую 25-цігэктаровую гаспадарку з забудаваньнем на асушаных г. зв. Вядатупіцкіх тарфовішчах, каля Івацэвіч у Коссаўскім пав. Аблічана пры гэтым, што на самых толькі зьмэліорованых палескіх тарфовішчах можна будзе пасадзіць аж 30 тысяч асадніцкіх сем'яў, а на рэшце Палесься (нетарфовішчах) — дальшыя 38 тысяч, знача разам 68 тысяч асадніцкіх гаспадароў, па 25 гэктараў кожны.

*) глядзі „Бел. Крыніцу" № 9—32 г.

На гэту мэту ўрад мае даваць запамогу ад сябе (у разсрочку на 43 гады), а Паветавы Соймік дае ад сябе (кожны год цалком па 50.000 зл., як беспрацэнтную пазыку). Перадаваньне і перайманьне гэткіх гаспадарак адбываецца што год ў м-цы сакавіку і колёністу, калі ён мае ўвесь патрэбны жывы і нежывы інвэнтар, каб асесьці на гэткай колёніі, хопіць мець гатоўкі 4.000 зл.

Ці ўсё так ёсьць, як апісуе інж. С. П., ці для польскага ў нас асадніцтва даюцца йшчэ большыя палёгкі і апека, мы дагэтуль ня мелі йшчэ магчымасьці спраўдзіць. Але калі справы стаяць і толькі гэтак, як тут падана ды калі прыняць пад увагу, што пасьля няўдалай спробы сколёнізаваць Палесьсе першым-лепшым матэр'ялам, пасылаюцца туды іменна Пазнанскія палякі, якія ў свой час на ўласнай скуры даведаліся, што такое колёнізацыя, ад ведамай Нямецкай Колёнізацыйнай Камісіі, — дык трэба прызнаць, што польскія кругі, у справе сколёнізаваньня Палесься, ставяць сягоньня на карту ўсё, што ўважаюць за найлепшае і найсільнейшае: не шкадуюць хоць-бы і найбольшых коштаў і шлюць туды дабраны матэр'ял людзкі, які толькі маюць.

Прапаганда за колёнізацыю Палесься на карысьць Пазнаншчыны вядзецца штораз сільней, а ўспомнены С. Половіч, пабываўшы з спэцыяльнай камісіяй на гэтым-жа Палесьсі асабіста, піша аб ім даслоўна гэтак: „Polesie to nie jałowy bagnisty teren, skazujący ludność na przekleństwo nędznego bytowania, ale wiele obiecująca ziemia... Polesie przedstawia środowisko olbrzymich możliwości rozwojowych"...

Параўноўваючы ўрэшце Палесьсе, як абшар на колёнізацыю, з такім-жа абшарам у Галіччыне ці на Валыні, гдзе гэткай колёнізацыі ўжо сягоньня на перашкодзе стаіць нацыянальная сьведамасьць мяйсцовай украінскай люднасьці, аўтор нядвузначна здраджае страх прад хуткім нацыянальным усьведамленьнем мяйсцовай беларускай (і украінскай) люднасьці і на Палесьсі і разумеючы, што тады было-б на колёнізацыю ўжо і тут за позна,—падганяе, як умее, польскую публічную думку, кажучы даслоўна, што: *„трэба дзеля гэтага стаўляць дакананыя факты (на Палесьсі — рэд.), покуль час"*. Усю-ж сваю „міласьць" да Палесься п. С. П. зьмясьціў у пажаданьні, каб што-хутчэй запанаваў кліч: „Polesie dla Wielkopolski!"

Як бачым, паны Пазнанякі на нястачу апэтыту жаліцца ня могуць і па прыкладу прускай гакаты прыняліся, „як трэба," заганяць г. зв. Палескі клін. Што з гэтага выйдзе, тут прарочыць ня будзем. Зазначым толькі, што калі вольна сягоньня паном Пазнаняком не толькі адкрыта гаварыць, але і працаваць у імя клічу „Polesie dla Wielkopolski!", дык вольна хіба будзе і нам прынамся сказаць, што дакананьць гэтага, без нарушэньня істотных інтарэсаў мясцовага беларускага і украінскага насельніцтва— немагчыма.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Не забывайцеся аб сваіх студэнтах беларусах!

Складайце ахвяры на «Стыпэндыяльны Фонд»!

Беларуская Дзяржаўная Акадэмія Сельскае Гаспадаркі ў Горы-Горках. (2)

Пры Акадэміі ёсьць некалькі фабрык, як цагельня, фабрыка дрэнэжных трубак і дахоўак, сьлясарня, электроўня... Час ад часу пры Акадэміі ладзяцца курсы для сялян і сельска-гаспадарчыя выстаўкі: хатніх птушак, трусоў і насеньня.

На асаблівую ўвагу заслугоўвае дасьледчая станцыя пры катэдры праф. К. Ренарда. Гэта станцыя мае наступныя сэкцыі: 1. палявых культур, 2. гародніцтва, 3. агрохэміі, 4. сэлекцыі (падбору), 5. эканомікі, 6. зоотэхнікі (гадоўлі жывёлы), 7. машыназнаўства, 8. фітопаталёгіі (навука аб расьцінных хваробах) 9. дасьледчыя палеткі ім. Стэбут'а, 10. спэцыяльныя культуры і г. д. і г. д. Гэта станцыя разьмешчана ў фальв. Іванаўцы, Дрыбіне і ў самых Г.-Горках. Пры станцыі ёсьць „Інстытут сялян—дасьледчыкаў" для зьвязку з сялянамі, якія хочуць весьці дасьледчую працу на сваіх гаспадарках.

Варта ўвагі таксама дасьледчая станцыя гадоўлі сьвіней у Малой Сьляпянцы пад Менскам.

Аб працах Горы-Гарэцкай Акадэміі выдана 20 тамоў (275 друкаваных аркушоў) справаздаўчых працаў.

Пры канцы праф. П. кажа, што „з боку чырвоных уладаў аднак ня рэдка сапраўды бываюць вялікія выдаткі на навуку, бо гэта робіць пэўную рэкляму перад заграніцай, каторая дае Саветам грошы; акрамя таго дае працу і робіць няшкоднымі вялікі лік людзей, якія маглі-б у іншым выпадку быць паважнымі ворагамі (Саветаў—рэд.). Што-ж да самых вучоных, дык гэтыя сапраўды працуюць добра, мо' так як нікой прад тым у Расеі; кажуць яны гэтак: „а што нам асталося рабіць, у навуцы асталася наша адзіная пацеха, няма ні таварыства, ні колішняй сям'і, ні колішніх дзяцей — бо іх у школе нацкоўвуюць на бацькоў, ні магчымасьці свабодна пагутарыць — вось і працуеш, чытаеш і думкамі пераносішся ў лепшы сьвет фантазіі і творства".

Гэтак прадстаўляецца справа з Горы-Гарэцкай Акадэміяй і магчымасьцю навуковай працы ў БССР наагул, паводле слоў праф. Правохэньскага і самых-жа савецкіх вучоных. — Ад сябе можам дадаць, што навуковы і арганізацыйны размах беларускіх Горы-Горак быў-бы яшчэ большы, каб іх ня ціснуў цяжар камуністычных формул і дагадак. Дзеля гэтага ў інтарэсе навукі і самае людзкасьці ляжыць, каб гэты цяжар нежыцьцёвых, а лепш — проціжыцьцёвых агранічэньняў як найхутчэй мінуў.

Хутка гэта зразумеюць сучасныя гаспадары палажэньня Савецкай Беларусі?

т.

Скасаваньне камісіі „Pro Russia".

Бясслаўная камісія „Pro Russia", аб каторай мы так часта пісалі і каторая праводзіла унію на нашых землях, скасавана. На яе месца паклікана камісія „Pro negotiis extraordinariis" („Для спраў надзвычайных"). Гэта новая камісія будзе праводзіць унію на нашых землях.

Праўду кажучы, перамена вышла толькі ў назове, бо на чале гэтай камісіі стаяць тыя самыя „русацяпы", якія стаялі дагэтуль на чале камісіі „Pro Russia".

З беларускага жыцьця.

У Віленскім Аддзеле Бел. Інстытуту Гаспадаркі і Культуры адбыўся ў мін. нядзелю 28 м. м. агульны гадавы сход сябраў. З справаздачы аб працы Аддзелу за мінулы год вынікае, што ён між іншым: арганізаваў 9 публічных навукова-папулярных лекцый, 4 таварыскія імпрэзы (запусныя бліны, Юр'е, Купальле...), таксама з адпаведнымі рэфэратамі. Лічбовы стан сяброў у Аддзелу на дзень 27 м.м. быў 29, стан касы (сальдо) 60.47 зл. Пры перавыбарах у Урад Аддзелу на новы працоўны год былі выбраны гр. гр.: М. Пазьняжова, інж. Ад. Клімовіч, Яз. Найдзюк, Яз. Малецкі, А. Аніська; у кандыдаты — гр. гр.: О. Калядзянка і Я Пешка. — Дэле гатам Аддзелу ў Раду Інстытуту выбраны Д р Бр. Туронак.

Віленскі Аддзел БІГіК ладзіць у нядзелю 6 г. м. ува ўласным памешканьні (Людвісарская вул. 1—19) публічную лекцыю Старшыні Цэнтр. Ураду Б.І.Г.іК. кс. В. Гадлеўскага, які дакончыць цыкль сваіх лекцыяў „Аб беларускай культуры і літэратуры". Пачатак роўна а гадз. 16-ай. — Уваход вольны.

Т-ва Беларусаведы ладзіць у нядзелю 6 г. м. ў 7 ай залі У.С.Б. публічную лекцыю „Аб жыцьці і творчасьці Ядвігіна Ш.", якую чытаціме студ. Хв. Ільяшэвіч. Пачатак лекцыі а гадз. 18-ай. Уваход вольны.

З выдавецкай нівы. Вышлі з друку: № 2 (37) месячніка „Шлях Моладзі" за м-ц люты. Зьмест дабраны да патрэбаў часу, цікавы і павучальны.

—„І культура і палітыка" (рэфэрат прачытаны на Зьезьдзе БХД дня 13 XII 31 г. ў Вільні) асобнай адбіткай, коштам „Бел. Крыніцы."

Усё дастаць можна ў бел. кнігарні „Pahonia" Wilnia, Zawalnaja 6—10.

Беларускі прадстаўнік у польскім Сойме бароніць інтарэсы беларускага народу.

У апошнія часы ў польскім Сойме пачалі пацьвярджацца розныя ўрадавыя праекты законаў і выходзіць адтуль як абавязуючыя ўставы. Між гэтымі ўставамі ёсьць і такія, што ў вялікай меры датычаць жыцьцёвых інтарэсаў беларускага народу.

Вось у гэткіх справах цяпер прыходзіцца бараніць інтарэсы беларускага народу толькі аднаму паслу Ф. Ярэмічу, у чым яму памагае Украінскі Пасольскі Клюб.

У м-цы лютым с. г. пасол Ярэміч сказаў тры абаронныя прамовы моцнага зьместу, маючыя гістарычнае значэньне, а іменна:

1) падчас пацьверджаньня ўрадавага праекту аб паноўным асадніцтве на беларускіх і ўкраінскіх землях — 17 лютага с. г.

2) пры абгаварываньні закону аб сабраньнях і таварыствах — 23 лютага с. г.

3) падчас дыскусіі над новым законам у справе школьніцтва.

Надрукаваць гэтых прамоваў ня можам з прычын ад нас незалежных.

Барацьба з ілжой.

У Вільні выходзіць газэціна „Беларускі Звон"—орган найнавейшых полёнафілаў А. Луцкевіча і кумпаніі. У гэтай газэціне паяўляюцца часта подлыя ілжывыя весткі аб беларусах і беларускіх інстытуцыях.

Ня так даўно пасла Ярэміча абараніў ад ілжы луцкевічаўскага „Бел. Звону" маршалкоўскі суд, а цяпер Пэдагагічная Рада Наваградзкай беларускай гімназіі бароніць ад масонскай чапаньці Наваградзкую бел. гімназію вось гэтым пісьмом:

У Рэдакцыю газэты «Белар. Крыніца»
ў Вільні
Людвісарская 1—19.

Паважаны Грамадзянін Рэдактар!

Ветліва просім на бачынах Вашае часопісі зьмясьціць некалькі ніжэйпададзеных радочкаў:

У № 7 (32) „Беларускага Звону" з 19 лютага г. г. надрукованы артыкул „Рызыкоўны крок," у якім гаворыцца, што „тваоцы і кіраўнікі беларускае прыватнае гімназіі ў Наваградку... пастанавілі распачаць перад урадам адпаведныя захады, каб дабіцца ператварэньня гэтае прыватнае школы —ў урадавую," што — акцыю гэтую ўжо распачала пэдагагічная рада гімназіі.

Катэгарычна сьцьвярджаем, што справа гэтая ніколі ня была на парадку дня Пэдагагічнай Рады Гімназіі, на паседжаньні Пэдагагічнай Рады не абгаварвалася, ніякае пастановы ў гэтым пытаньні прынята ня было, а, значыцца, ніякіх захадаў перад кімнебудзь ня было роблена.

М. Чэтырко — *Я. ЦехаНоўскі*
сэкрэтар Старшыня Пэдагагічнай Рады.

Наваградак, 23 лютага 1932 году.

З Польшчы.

З Сойму. У Сойме цяпер пякуцца новыя уставы (законы) адна за другой, як у добра распаленай печы бліны.

Прыняты новы закон аб асадніцтве і ўстава новага ўстройства школ.

Упадак гандлю. У польскіх прамысловых кругох непакояцца весткамі, што Англія стараецца ўцягнуць у сваё гандлёвае аб'яднаньне ўсю Скандынаўскую краіну. Такое аб'яднаньне пагражае поўнай ліквідацыяй скандынаўскага рынку збыту для польскага промыслу, асабліва каменнавугольнага, вываз каторага і бяз гэтага вельмі панізіўся.

Апрача гэтага закрыўся для Польшчы найбольшы рынак збыту і масла, бо Нямеччына падняла вялікае мыта на ўвожанае масла, а Польшча бадай найбольш дагэтуль вывозіла масла ў Нямеччыну.

Надпрадукцыя сьпірытусу. Польскі сьпірытусовы манаполь заграм жджаны сьпірытусам, а купляць няма каму, бо крызіс праняў ужо ўсе слаі грамадзянства.

Падвышэньне паштовай тарыфы прынесла не даход, а дэфіцыт. Апошняе ўздаражэньне паштовых перасылак не толькі што не дало даходу дзяржаве, але прынесла дэфіцыт, бо людзі пачалі менш карыстацца поштай, агранічваючыся да неабходнасьці.

З заграніцы.

Праца канфэрэнцыі ў справе разаружэньня памалу пасоўваецца наперад. З важнейшых пастаноў трэба адзначыць выражаную ўсімі ўчасьнікамі канфэрэнцыі **забарону хэмічнай (газавай) вайны**. Апроч гэтага ў галоўнай камісіі канфэрэнцыі дэлегат СССР Літвінаў матываваў сваю рэзалюцыю ў справе неадкладнага і **поўнага** разаружэньня ўсіх дзяржаў. Пры галасаваньні за рэзалюцыю Літвінава галасаваў толькі сам Літвінаў і турэц і дэлегат, а ўсе былі проціў; на яе месца была прынята рэзалюцыя англійскага дэлегата Саймона, які заклікаў да **частковага** разаружэньня, да агранічэньня далейшага ўваружэньня і да ўзаемнага даверу п між дзяржавамі.

Рэзалюцыю Саймона камісія прыняла аднагалосна. Пасьля гэтага былі створаны: палітычная, паветранная, марская, сухапутная і бюджэтная камісіі.

Байка аб канфэрэнцыі. Гішпанскі дэлегат прачытаў на канфэрэнцыі байку, як леў, арол, тыгр, бык і мядзьведзь сабраліся на канфэрэнцыю, каб разаружыцца. Леў, глядзячы на арла, трэбаваў яму абрэзаць крыльля, арол-жа, паглядаючы скоса на быка, радзіў ліквідаваць яму рогі, бык, баючыся тыгра, запрапанаваў вырваць яму пазуры, а мядзьведзь (разумей СССР) прывітаў ліквідацыю ўсіх спосабаў нападу і абароны каб магчы „папрыяцельску" абняць усіх сваіх ворагаў. Кажуць, што ўсе дыпляматы, у тым ліку і Літвінаў, рагаталі, слухаючы гэтай байкі.

Як бачым і на паважнай канфэрэнцыі бывае весела.

Пісьмо Стімсона. Стагс-сэкрэтар (міністар) замежных спраў Зл. Шт. П.-Амэрыкі Стімсон прыслаў пісьмо да ведамага сэнатара Борага У гэтым пісьме Стімсон сьцьвярджае зламаньне Японіяй дагавору 9-ці дзяржаў аб непарушнасьці граніц Кітаю, нарушэньне пакту Кельлёга і гразіць, што калі Японія не адкажацца ад захопніцкіх тэндэнцыяў у Кітаі, то Амэрыка адкажацца ад Вашынгтонскага дагавору, паводле якога таннаж 5-ці вялікіх дзяржаў: Амэрыкі, Англіі, Японіі, Францыі і Італіі азначаўся прапорцыяй 5:5:3:1,75:1,75 і пачне будаваць новыя вялікія караблі.

Газэты пішуць, што гэта пісьмо, хоць

У 10-ыя ўгодкі сьмерці Ядвігіна Ш. (Антона Лявіцкага).

(24.II.1922—24.II.1932).

Беларускі сучасны адраджэнскі рух пачала беларуская абяднеўшая, часта значна спольшчаная, шляхта. Прычынай гэтага так важнага для беларускага народу і аднача сна цікавага зьявішча была як сама заходня-эўропэйская культура, так і грамадзка-палітычныя тагочасныя абставіны Беларусаў, калі гэтыя першыя сяўцы нашага народнага адраджэньня жылі і дзеялі.

Гэткім быў патрыярх нашага адраджэньня Фр. Багушэвіч, гэткімі былі ягоныя бесапасрэдныя наступнікі — Няслухоўскі, Бр. Шыпіла, Ян Луцкевіч, Карусь Каганец (Каз. Кастравіцкі), Цётка (Алёіза Пашкевічышка), гэткім быў і Ядвігін Ш. (Антон Лявіцкі), сьветлай памяці якога, з прычыны дзесятых угодкаў ягонай сьмерці, пасьвячаем гэтых некалькі зацемак.

*

Антон Лявіцкі паходзіць з старадаўнай беларускай, каталіцкай шляхты. Радзіўся ён у 1869 г. у двары Добасьня ў Магілёўшчыне, дзе бацька яго служыў эканомам. Тут-жа малы Лявіцкі і правёў свае дзіцячыя гады.

З Добасьні бацькі Антона пераехалі ў двор Першаі ў Меншчыне. Адгэтуль езьдзіў ён на навукі, сьпярша ў Менск, а пасьля ў 90 ых гадох мінулага сталецьця ў Маскоўскі ўнівэрсытэт на лякарскі аддзел. Тут ён ужо належыў да рэвалюцыйна-вызвольнага руху сярод студэнства. Быў арыштаваны — сядзеў у Бутырскай турме ў Маскве, а пасьля ў Петрапаўлаўскай крэпасьці ў Пецярбурзе. Вышаўшы з турмы Антон Лявіцкі пакінуў мэдыцыну, а перайшоў на фармацыю. Здаўшы ўрэшце экзамен на правізара, працаваў у аптэцы ў Радашкавічах. Працу гэту, па слабасьці здароўя, так-жа хутка пакінуў і далей ужо працаваў у Хаўрусnай Краме ў тых-жа Радашкавічах, недалёка ад якіх, у ўласным фальварку Карпілаўцы, жыла тады ўжо аўдавеўшая яго маці.

У 1897 г. Антон Лявіцкі з сям'ёй пераяжджае ў Карпілаўку і займаецца гаспадаркай, асабліва садоўніцтвам.

У 1903 г. ён пераяжджае ў Вільню, дзе супрацоўнічае ў расейскіх і польскіх газэтах, а пасьля году варочаецца ўзноў у Карпілаўку. Калі ў 1906 г. паўстае беларуская часопісь „Наша Доля", а пасьля „Наша Ніва", Ант. Лявіцкі ўжо ўсё жыцьцё сваё зьвязвае з беларускім літэратурным і грамадзкім рухам: — бывае часта ў Вільні, супрацоўнічае ў „Нашай Ніве", а ўрэшце жыве тут стала, дзе, як рэдактар, працуе ў беларускай каталіцкай часопісі (1913—1914) „Bielarus" і ў тэй-жа „Нашай Ніве".

Вясной 1914 г. А Лявіцкі пераехаў у Менск, дзе быў рэдактарам часопісяў „Саха" і „Лучынка". Увесь час вайны (1914—1917) ён астаецца ў Менску, дзе гледзячы на цяжкія варункі і на патрэбу зарабляць на ўтрыманьне сваей сям'і, шырока працуе на беларускай грамадзкай ніве і зьяўляецца душой невялічкага тады ў Менску гуртка беларускіх дзеячоў.

У часе рэвалюцыі 1917 г. Ант. Лявіцкі яшчэ з большай энэргіяй працуе на беларускай грамадзкай ніве; ён так-жа ўваходзе як сябра ў склад Рады Беларускай Народнай Рэспублікі.

Але надмерная праца і цяжкія варункі жыцьця падкасілі яго сілы. У яго аказаліся сухоты. 1918 г. А. Лявіцкі ляжыць у шпіталі, пасьля варочаецца дамоў у Карпілаўку. Урэшце зусім хворы, пад восень 1920 г., ён выяжджае ў Вільню, дзе 24.II.1922 г., у Літоўскай клініцы, як добры хрысьціянін, прыняўшы сьв. Тайны, у разлуцы з сям'ёй, расстаўся з гэтым сьветам. Пахаваны на вілен-

адрэсавана сэнатару Борэг, празначана для Японіі. Амэрыка мае, апрач будаваньня новых ваенных караблёў, укрэпляць Гавайскія астравы і Філіпіны, што ляжаць па суседзтву з Японіяй.

З усяго відаць, што канфлікт паміж Японіяй і Амэрыкай сьпее штораз болей.

Выбары ў Японіі далі аграмадную большасьць цяперашняму ўраду Інукая, які мае разьвязаныя рукі ў японскіх ваенных плянах.

Выбары прэзыдэнта ў Нямеччыне адбудуцца 13 сакавіка. Ня трэба казаць, што гэтыя выбары будуць мець гістарычнае значэньне ня толькі для Нямеччыны, але і для ўсей Эўропы. Змагацца будуць Гіндэнбург і Гітлер. Пры перамозе Гітлера падзеі могуць пайсьці вельмі скорым тэмпам у няведамым кірунку.

Троцкага ня пускаюць у Чэхаславаччыну. Троцкі, які цяпер прабывае ў Турцыі, выслаў просьбу да чэхаславацкага ўраду, каб яму пазволілі прыехаць палячыцца на цёплыя воды. Аднак чэхаславацкі ўрад адмовіў. Троцкі, як ведама, будучы ў 1918 г. галоўнакамандуючым чырвонай арміяй выдаў загад разаружэньня чэхаславацкіх легіонаў.

З другога боку савецкі ўрад адабраў нядаўна ў Троцкага савецкае грамадзянства і гэтым адняў ад яго магчымасьць калі-небудзь вярнуцца ў Саветы. Так і прыдзецца старому Троцкаму паміраць заграніцай. Добра, што не на Салаўках!

Японцы ўзялі Кіанг-Ванг. На шанхайскім фронце змаганьне цягнулася даўжэйшы час з пераменным шчасьцем. Былі такія мамэнты, што кітайцы білі японцаў. Апошнім часам японцы пачалі рашучае наступленьне, у рэзультаце якога быў узяты горад Кіанг-Ванг (каля 150 тысяч жыхароў), які ляжыць каля Шанхаю. Кіанг-Ванг зьнішчаны да званьня — там, дзе нядаўна былі вуліцы і дамы, адны акопы і руіны. Найболей страт робяць кітайцам ваенныя аэрапляны, якія кідаюць бомбы — ад іх нельга схавацца. Кажуць, што дух кітайскай арміі падае.

У Манджурыі японцы абсаджваюць сваім войскам савецкую граніцу над Амурам і твораць белагвардзейскія аддзелы на выпадак вайны з саветамі.

Паўстаньне сялян у Фінляндыі. Газэты падаюць, што ў Фінляндыі, ў мяйсцовасьці Мантэле, пачалося паўстаньне сялян проціў ураду.

Паўстанцы выслалі да ўраду дамаганьне, каб падаўся ў адстаўку міністар унутраных спраў і губэрнатар правінцыі. Урад падаўся ў адстаўку ўвесь.

Дзеля таго, што сяляне намераны узброіўшыся пайсьці ў сталіцу Гэльсінгфорс і там завясьці свае парадкі, урад выдаў прыказ бараніць сталіцу войскам. Урадавае войска з кулямётамі расстаўлена па дарогах каля Гэльсінгфорсу і такім чынам мае недапусьціць у места сялянскіх паўстанцаў.

Бальшавікі ў страху, каб не паўстала ў краю Забайкальскім „белагвардзейская Расея." Газэты падаюць, што бальшавіцкі ўрад у Маскве непакоіцца: 1) ажыўленым рухам „белагвардзейцаў" у Манджурыі, 2) канцэнтрацыяй японскага войска на савецка-карэйскай граніцы, 3) займаньнем японцамі паўночнай Манджурыі і 4) проціўсавецкім настроем Японіі.

У Маскве гавораць, што Японія, у згодзе з Амэрыкай Францыяй і Англіяй імкнецца заняць Уладывасток і краіну Забайкалу, а пасьля ўтварыць з іх „белагвардзейскую" Расею, як пачатак будучай Расеі небальшавіцкай.

Масква бяз мяса. Французкае пасольства ў Рызе атрымала гэтымі днямі тэлеграму з французкага пасольства ў Маскве з просьбай прыслаць мяса для працаўнікоў пасольства, бо ў Маскве за ніякую цану мяса няма дзе купіць. Французкае пасольства ў Рызе адумысным пасланцом паслала ў Маскву 30 кіляґр. мяса і рыскай каўбасы.

Францыя не дае жанчыне роўнапраўя. У Францыі дагэтуль жанчына ня мае роўных правоў з мужчынамі ў публічным жыцьці і ня можа галасаваць пры выбарах. Аднагдай, калі французкі сэнат разглядаў гэту справу, на залі (на галерыі) сэнату зьявіліся прадстаўніцы ад французкіх жаночых арганізацыяў з трэбаваньнем роўнаправія, а на знак дагэтулешняй для іх крыўды і пратэсту проціў яе, прывязалі ланцугамі да слупа на гэтай-жа галерыі адну спаміж сваіх жанчын сяброўак.

З Краю.

Сын, закаваны бацькам у ланцугі, памёр з голаду. Страшныя рэчы часам ходзяць па людзях. Газэты пішуць, што ў в. Куны, Пядбярэзкай гм. знайшлі ў пограбе труп мужчыны прыкутага ланцугом да сьцяны. Аказалася, што гэта быў труп Адама Парнуса, якога бацька як дурнога і небясьпечнага прыкаваў да сьцяны. Ніхто аб гэтым ня ведаў. Па нейкім часе здарылася так, што бацька памёр. У гэтым часе памёр і сын галоднай сьмерцю. Агледзіў ягоны труп новы ўласьнік таго дому, заглянуўшы і ў пограб.

З Вільні.

Арышты сярод літоўскай моладзі. Гэтымі днямі ўлады арыштавалі 7 асоб літоўскай моладзі, западозраных у камунізьме.

Большасьць арыштаваных гэта б. вучні літоўскай гімназіі ў Вільні, якіх дырэкцыя гімназіі месяцы два таму з гімназіі выключыла.

Чытайце і пашырайце

„Беларускую Крыніцу!"

Аб Вільні.

Часта з далёкіх краёў прыяжджаюць у Вільню вучоныя і публіцысты, каб пазнаць і ацаніць гэта старое места. Свае ўражаньні яны апісываюць у газэтах або расказываюць знаёмым, падзіўляючы красу віленскіх касьцёлаў, цэркваў, а так-жа апісываюць і расказываюць аб віленскіх навуковых установах, прыгожых палацах, аб тэатрах, кінах і розных клюбах. Дзівяцца з памятнікаў і захопліваюцца радіо-станцыяй.

Далёкаму ад Вільні чытачу або слухачу гэтых вестак і ў галаву ня прыходзіць, што ў гэтай-жа Вільні, асабліва на прадмесьці, побач з раскошнымі палацамі, красою будаўнічага мастацтва сьвятыняў, навуковых установ, кінаў, тэатраў і вясёлых клюбаў, жывуць у нязносных варунках жыхары гэтага прыгожага і слаўнага места — Вільня.

Вось на прадмесьцях, асабліва каля радіо-станцыі, пры гасьцінцах: Ашмянскім, Лідзкім і „Чорным" стаяць параськіданыя хаткі, жыхары якіх ня толькі не карыстаюць з падбочнай радіо-станцыі, але дасвоўна змагаюцца з голадам і холадам. Адчыніўшы дзьверы гэтай хаткі, ня ведаеш, куды заходзіш — у хлеў, катух ці ў памешканьне людзкое. У гэтай хатцы брудна нязносная задуха. Прышоўшага акружаюць з цікавасьцяй брудныя, худыя, з крывымі як абадні нагамі дзеці. Гэтыя будучыя грамадзяне м. Вільні пакрыты балячкамі, лішаямі і высыпкай на галаве. Старэйшыя акідаюць увайшоўшага няпрыхільным зорам, падазраючы ў выпадковым госьцю сэквэстратара, або каго іншага, прыбыўшага па заплату падаткаў або іншай павіннасьці. Мэблі ў хатцы няма, сесьці няма на чым. Маемасьць гэтых грамадзян слаўнай Вільні складаецца з паўтара гэктара падместавай зямлі, на якой яны сеюць заўсягды жыта і бульбу. Сярод гэтых грамадзян культурнага асяродка нашага краю вельмі рэдка ўдасца спаткаць пісьменнага, каб мог расьпісацца. Умеюць толькі чытаць на *сваіх* кніжках да набажэнства, а многім і гэта „штука" недаступна. Гавораць яны беларуска-літоўска-польскай мешанінай, што сьведчыць аб іх беларускім і літоўскім паходжаньні. Гэтым грамадзянам усё роўна, якая ўлада ў краю. Яны заяўляюць, што горш ужо ім ня будзе, як ёсьць. Што мае быць новым і ў якой форме можа наступіць гэтае лепшае, яны сабе не ўяўляюць. Але чагось чакаюць і спадзяюцца.

Дык вось які другі бок мэдалю віленскай „культуры." Аб гэтым да паўнаты пазнаньня Вільні трэба было-б ведаць і тым, што адведываюць Вільню і аглядаюць віленскую культуру, а так-жа і тым, каторыя пішуць кніжкі аб Вільні, паказываючы яе культуру другім.

Я **Малецкі.**
б. сьпісовы Камісар.

скіх могілках Роса, у прыгожым і відным мейсцы, недалёка ад галоўнай брамы, направа ад дарожкі.

*

На ніве беларускай літэратуры Ант. Лявіцкі, пад мянюшкай Ядвігін Ш., працуе яшчэ будучы студэнтам. Так, у Маскве, ён перакладае з расейскай на беларускую мову апавяданьне Гаршына „Сыгнал", якое выходзіць кніжыцай у Маскве ў 1891 г. Ад гэтага часу Ядвігін Ш. ужо не пакідае беларускай літэратурнай працы, хоць ня было яшчэ тады дзе друкаваць яе. Значна творства яго ажыўляецца ў 1906 г., калі паўстае „Наша Доля", а за ей—„Наша Ніва", у якіх пісьменьнік наш друкуе свае творы. Славу-ж беларускага пісьменьніка здабывае ўжо выразна з 1909 г., калі быў літэратурным кіраўніком „Нашай Нівы".

З гэтага-ж часу творы Ядвігіна Ш. пачалі ў Вільні выходзіць наступнымі кніжкамі: „Дзед Завала" (1910), „Бярозка" (1912), „Васількі" (1914), „Uspaminy" (1921).

У творах сваіх, моў у люстры, Ядвігін Ш адбіваецца як праўдзівы мастак. Праз свае творы ён беспасрэдна не праводзіць ані ідэалаў нацыянальных, ані соцыяльна палітычных, але ён, у сапраўды мастацкай беларускай форме малюе абразкі беларускага шэрага жыцьця і гэткім чынам служа выдатна беларускай народнай справе. Форма ягоных твораў — гэта кароткія апавяданьні байкі, новэлькі.

Творчасьць Ядвігіна Ш., паводле яе ідэовага характару, крытыкі беларускай літэратуры (М. Гарэцкі, праф. М Піотуховіч) звычайна дзеляць на дзьве групы — на апавяданьні гумарыстычныя, жартаўліва-сьмяхотныя і на сур'ёзна-ідэовыя, з глыбокім беларускім бытавым і псыхолёгічным зьместам. Здаецца нам аднак, што гэткі падзел ня зусім слушны. На наш пагляд і гэтыя быццам пустыя, сьмяхотлівыя апавяданьні, як „З малым білецікам", „Важная фіга", „Заморскі зьвер", „Вучоны бык" і інш., мэтай сваей маюць ня пусты і вясёлы сьмех з беларускага селяніна, а зусім што іншае. Сьмяхотныя гэныя творы імкнуцца да таго, каб у алегорычнай форме, з горкай іроніяй, з сьмехам праз сьлёзы, намаляваць жудасна — беспрасьветнае і загнанае жыцьцё беларуса, выклікаць гэтым агіду да гэнага жыцьця і абудзіць у ім зразуменьне і пажаданьне жыцьця лепшага, сьвятлейшага, больш дастойнага.

Такім чынам трэба сказаць, што формай, спосабам, творы Ядвігіна Ш. сапраўды даюцца падзяліць на дзьве групы, але зьместам —бадай што не: зьместам яны бадай аднолькавыя. Заблізка пісьменнік наш быў да народу, загарачым ён быў беларускім адраджэнцам, каб у творах сваіх выстаўляў выключна на сьмех свайго гаротнага брата. Не, гэны зьмест ягоны гэта пераважна „сьмех праз сьлёзы."

*

23.II 1932 г. моладзь Віленскай Беларускай Гімназіі, на чале з сваімі вучыцялямі, з прычыны дзесятых угодкаў сьмерці Ядвігіна Ш., адведала яго магілку, дзе быў адыграны жалобны марш, сказана прамова і ўзложаны вянок на Ягоную магілку.—Гэтак маладое пакаленьне ўшанавала памяць свайго пісьменьніка. Астаецца толькі яшчэ пажадаць, каб беларускае маладое пакаленьне часьцей адведвала ягоную магілку, глыбей удумывалася ў зьмест ягоных твораў ды старалася зьнішчыць у беларускім народным жыцьці тыя сьмяхотна горкія асаблівасьці, з якіх праз сьлёзы пісьменьнік наш сьмяяўся. Было-б гэта яшчэ большым ушанаваньнем ягонай сьветлай памяці, бо было-б гэта спаўненьнем аднэй з галоўнай ідэі ягонага творства.

А. Сакалінскі.

Да нас пішуць.

ПАЛІЦЫЯ ЗАБАРАНЯЕ ГАВАРЫЦЬ ПА-БЕЛАРУСКУ І ІНШ. БЕДЫ.

Ляхавічы, Баранавіцкага павету. 22 студзеня г. г. у нас было каталіцкае парафіяльнае сабраньне, і адначасна была парушана справа выбараў у меставую раду, (магістрат). На сабраньне прышло 2-х паліцэйскіх. Прышоў на сабраньне і ведамы В. Кувцэвіч, які маючы больш як 50 гэкт. найлепшай зямлі, служыць школьным стражам. Цікавым было такое здарэньне, калі п. А. Попка, як старшыня сабраньня: зьвярнуўся да В. Кувцэвіча з словамі, каб ён не перашкаджаў, бо змушаны будзе ў праціўным выпадку прасіць інтэрвэнцыі паліцыі, В. Кувцэвіч адказаў: „напляваць мне на паліцыю, я сам паліцыя," а прысутныя паліцэйскія на гэта нічога.—Калі сэкрэтар касьцельнага камітэту І. Чарвіцкі стаў рэфараваць справы касьцельныя і пасьля, як сябра выбарнага хрысьціянскага камітэту, пачаў паясьняць справу выбараў у меставую раду, то *паліцэйскі Гонсецкі ці Гонсеўскі забараніў гаварыць пабеларуску*, пагражаючы разагнаньнем сабраньня; пры гэтым заявіў, што ў межах Польшчы гаварыць непапольску ня можна. Што на гэта вышэйшая ўлада?

БЫВАЕ Й ГЭТАК.

Неяк Калядмі, мяйсцовы гурток Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, хочачы зладзіць беларускае прадстаўленьне, падаў у Баранавіцкае староства просьбу аб дазвол, далучыўшы копіі сцэнічных твораў. На гэтую просьбу гурток атрымаў з Староства адмоўны адказ, што трэба прадставіць сцэнічныя творы апрабаваныя адпаведнымі ўладамі.

Тады моладзь, ня ведаючы, дзе шукаць гэтай апробаты, зьвярнулася да мяйсцовага польскага вучыцеля з просьбай дастаць дазвол на прадстаўленьне гэтых беларускіх сцэнічных твораў, абяцаючы запісацца ў польскае стоважышэнне моладзежы. Вучыцель, дзякуй яму, паслухаўі, як кажуць папольску, „на почэканю" тэлефонічна дастаў з староства дазвол адыграць гэтыя-ж сцэнічныя творы.

Дык вось бывае і так! **Чай.**

АД РЭДАКЦЫІ: Калі-б нейдзе здарыліся гэткія ці падобныя выпадкі *забароны публічна гаварыць пабеларуску*, просімо аб гэтым неадкладна нас паведамляць. Трэба пры гэтым апісаць цэлае здарэньне і падаць сьведкаў (імя, прозьвішча, вёк, адрэс).

ПАЛІЦЫЯ ПАМАГАЕ СЭКВЭСТРАТАРАМ ЗАБІРАЦЬ ПАДУШКІ, А ПОЛЬСКІЯ АСАДНІКІ ЖАБРУЮЦЬ.

Азяраны, Навагрудзкага пав. Жыцьцё нашага селяніна такое цяжкое, што і апісаць трудна. Усё сялянскае танна, заработкаў няма, а залатоўкі так патрэбныя на падаткі, каб адчапіцца ад сэквэстратара, хоць ты плач. Сэквэстратары з вёскі проста ня выходзяць. Апісываюць яны пераважна сьвяточную вопратку і падушкі, бо карову ці цялушку хто-ж купіць? А падушку можа купіць паліцэйскі або гмінны ўрадавец. Але з падушкамі нашы бабулькі і маладзіцы ня прывыклі разлучацца, дык у вёсцы паўстае такі гармідар, што і расказаць трудна. Каб усьмірыць бабуляк і маладзіц узбурыўшыхся на сэквэстратараў за падушкі і сьвяточную вопратку, цэлымі дзесяткамі зьяўляецца ў вёску паліцыя, піша пратаколы і абараняюць сэквэстратараў ад разгарміданаванага жаноцтва, як яны забіраюць апісаныя падушкі.

Асаднікі ў нас так ужо пагалелі, што некаторыя жабруюць.

Азяранец.

СЬМЕШНАЯ ПРАЦА І СЬЛЁЗНАЯ ПЛАТА.

Вёска Бараўкі, Пастаўскай гміны. Кажуць, ня можна стыдацца працы, — гэта праўда, але трэба стыдацца не заплаціць за працу або выкарыстываць людзей у працы, ды яшчэ і падсьміхацца з людзей патрабуючых заработку. Але ў людзей пагляды розныя. Адны стыдаюцца і падумаць, каб каго ашукаць, а другія — абы ўдалося.

Вось у нас здарылася такая справа; як яе заквал[і]фікаваць, няхай чытачы самі асудзяць, а выглядае яна гэтак:

Неяк Калядамі нашы гмінныя ўрадаўцы, на чале з войтам і адміністратар мяйсцовага двара задумалі зрабіць аблаву на зайцаў. Прад аблавай гмінны пісар прышоў у нашу вёску, заахвоціў 18 асоб сялян на загавячоў і абяцаў усім заплаціць за вышуківаньне і загонку зайцаў. Хоць гэтая функцыя належыць да сабак, але, каб зарабіць на соль, згадзіліся заганяць зайцаў і нашы сяляне. Ганялі ад самага раньня да позняга вечара, паны настралялі зайцаў, колькі хацелі, а ўвечары заплацілі толькі 12 заганячом па залатоўцы, а 6-м сказалі, што яны ў заговку не надаюцца і заплаты не атрымаюць. **В. С.**

БЕЛАРУСКАЕ ПРАДСТАЎЛЕНЬНЕ.

Малая Лотва, Баранавіцкага пав. Ляхавіцкім гуртком Б. І. Г. і К., да каторага і наша моладзь належыць, было ў нас 7 лютага г. г. зладжана беларускае прадстаўленьне. Народу было многа, зацікаўленьне беларускасьцю відавочна расьце. Дзякаваць Богу, наша моладзь ідзе ўпярод, да дабра. **Ч.**

У НАС СТАЯЦЬ ЗА СВАЁ.

Іказьнь, Браслаўскага пав. У нас ужо ўсе ведаюць, што яны беларусы. Мала таго, што аб гэтым усе ведаюць, але за сваё моцна стаяць. Падчас перапісі, калі сьпісовыя камісары, хочачы запісаць нашым людзям „jenzyk ojčysty" польскі, тлумачылі, што мовы беларускай няма, нашы людзі ўсё ж [illegible] цьвердзілі, што яны беларусы, а мова наша — беларуская.

Моладзь наша дык і надта горача бярэцца за беларускую праву. Ахвотна ідзе ў гурток Бел. Інстытуту Гасп. і Культуры і там мацуецца сама і старэйшых падахвочвае. У нас беларушчыны ўжо дзякаваць Богу людзі ня стыдаюцца, нават польскія асаднікі і тыя беларушчацца — гавораць пабеларуску, пяюць беларускія песьні і скачуць нашу беларускую лятовіху. **Малады Беларус.**

ЦЕМРА РОДЗІЦЬ І НЕНАВІСЬЦЬ.

Новы Пагост, Браслаўскага пав. Найбольшы вораг чалавеку — гэта цемра. Цемра — гэта матка ўсялякіх бед. Цёмныя людзі ненавідзяць адны другіх, а нават і родных дзяцей.

Вось у нас адзін селянін праз сваю цемру згубіў і любоў да роднага сына толькі таму што яго сын будучы ў Францыі захварэў на сухоты, цяпер ня можа бацьку зарабляць грошай. Замест памагчы няшчаснаму сыну, бацька-дзікун не дае хвораму сыну і таго, што сын у яго з апошніх ашчаднасьцяў купіў.— Дык прасьвячаймася, каб ня быць ворагамі і сваім дзецям.

Гаротнік.

АБ НАШЫМ ЖЫЦЬЦІ.

Будслаў, Вялейскага пав. Ня буду я пісаць аб усіх бедах вясковага жыцьця, бо ўсяго і апісаць трудна. Напішу толькі аб некаторых здарэньнях і аб нашым беларускім жыцьці нашай ваколіцы.

У пачатку студзеня с. г. наш войт разаслаў па гміне праз солтысаў абвестку Вялейскага „Рольніка" (Павятовая Спулдзельня Рольніча-Гандлёва у Віленцэ), заахвочваючы сялян бараніцца ад вызыску гандляроў праз гэты „Рольнік," абвяшчаючы, што „Рольнік" прымае на ст. у Будславе кормленых сьвіней і плаціць па 80—70—60 гр. за кілёграм жывой вагі. Людзі паслухалі; павезьлі сьвіней на ст. Будслаў і здалі „Рольніку." Але пасьля разрахунку атрымалі па 49,36,33,30 29 і 29 гр. за кілё, гледзячы, якой вагі была адзінка кормнай сьвіні. Дык вышла, што ў „Рольніку" куды таней, як на рынку ў гандляра, бо адзін селянін атрымаў ад „Рольніка" за свайго парсюка 56 зл., за якога гандляр на рынку даваў 85 зл.

Моладзь з блізкай вёскі Алешак закраталася каля роднай працы. Але яна слаба арганізавана, дык і выходзіць у іх нешта паўлюдзкога. Зладзіла гэта моладзь беларускае прадстаўленьне, быў сякі-такі даход, дык замест каб купіць кніжак або выпісаць газэту — ўзялі і прапілі „пішку." Стыдна, дурна і сьмешна. Але на другі раз можа паправяцца.

У нас, калі хто і хоча шкодзіць беларускай справе, дык можа гэтага даканаць толькі падыходам з боку беларускага — пабеларуску. Вось, каб перашкодзіць у беларускай працы і ў нашых Верабёх знашоўся „беларусін-паляк," як і ў Вільні п. Л. Гэты наш двулічнік таксама, як і п. Л., шкодзіць беларускай справе знутра—пабеларуску; ладзіць беларускія прадстаўленьні на польскі лад і разьбівае беларускую еднасьць. Заплату ён мае, што зайцоў страляе. Танна згадзіўся!

Селянін з-пад Вераб'ёў.

КРЫХУ АБ ДЗЕЙНАСЬЦІ НАШАГА КООПЭРАТЫВУ.

Вёска Вялікая Ліпа, Нясьвіскага павету; 7.XII 1931 г. адбылася агульная зборка сяброў нашага малочарскага коопэратыву. На парадку дня была справаздача з будоўлі дому і справа недахвату грошаў. Справу рэфэраваў скарбнік малачарні гр. М. Сашка. Недахват грошай у малачарні, як высьвілася, ёсьць дзеля таго, што шмат сяброў яшчэ не ўплацілі сваіх паёў.

Трэба сказаць, што сябры Ліпаўскае малачарні дагэтуль ваагул адносяцца да свае арганізацыі з поўнай сьведамасьцяй.

Праўда, што і коопэратыў дае нашаму сялянству вялікія ўслугі. Напрыклад: у малачарні ёсьць падручнікі, як даглядаць жывёлу і інструменты да ратаваньня жывёлы пры хваробах. Зарганізаваны пры малачарні і фонд страхаваньня ад упадку жывёлы.

Нядаўна Ліпаўцы пастанавілі пры малачарні адчыніць і коопэратыўную краму. Цяжкая гэта справа, з-усюль пачалі вылазіць розныя „парадчыкі," каторыя выехалі, што коопэратыўная крама наступіць ім на хвост і пачалі розныя нягодныя плёткі. Але недачаканьне ізнае! Ліпаўцы ўжо ведаюць цану і вартасьць свайй роднай коопэрацыі.

Мы ідзём наперад памалу, але назад не адступаем і адвэй пядзі.

Коопэратар.

СЭКТАНСКІЯ „ЦУДЫ."

Яжэвічы, Нясьвіскага пав. Апошнім часам сярод нашага праваслаўнага насельніцтва пачаў пашырацца баптызм. Сьмешная гэта сэкта! Ейныя вызнавальнікі робяць від, што ня вераць „у ніякія цуды." І пасьля гэтага аднак пачынаюць рабіць „цуды" самі. Але як? Аб гэтым і пісаць нейк: спачатку мажуць нейкія крыжы на шыбах вакон, а пасьля дзівуюцца, „скуль гэта ўзялося?" Ды яшчэ людзей з далёкіх вёсак цягнуць на гэта глядзець.

Браты сяляне, змагайцеся з сэктанствам, бо яно толькі дурыць людзей!

Праваслаўны Беларус.

ГРАМАДЗЯНЕ!

Закладайце гурткі Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры!

УВАГА!

Беларуская Кнігарня «ПАГОНЯ» перанесена з Людвісарскай 1, на ЗАВАЛЬНУЮ 6—10.

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.